**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за люты 2023 г.

## <u>Мерапрыемствы да Тыдня роднай мовы</u>

**21 лютага**

Адбыўся конкурс чытання тэкстаў на беларускай мове «Чытайка», які арганізавала Наталля Кандрашук – член Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўнік літаратурнага клуба «ПоэтиКо». Шаснаццаць канкурсантаў без падрыхтоўкі чыталі тэксты, якія выцягвалі, як экзаменацыйныя білеты. Конкурс складаўся з двух тураў: паэзія і проза. Прапанаваныя для канкурсантаў тэксты належалі пяру кобрынскіх аўтараў. Па выніках работы журы вызначыліся 3 пераможцы: Дар'я Мартынчук (1 месца), Валянціна Кірыеўская (2 месца), Паліна Семянчук (3 месца). Яны разам з прызамі атрымалі дыпломы ад Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, а ўсе ўдзельнікі конкурсу, у тым ліку і пераможцы, узнагароджаны сертыфікатамі на бясплатнае карыстанне кнігамі павышанага попыту.

*Елізарава, Ж. «Чытайка» па-беларуску / Жана Елізарава // Кобрынскі веснік. – 2023. – 25 лютага (№ 15). – С. 4.*

*ЦРБ, 35 чал.*

**21 лютага**

Падчас правядзення турніра «Знаўцы роднай мовы» прысутныя даведаліся аб гісторыі ўзнікнення свята, паслухалі легенду аб мове, вершы «У нас сваіх хапае слоў», «10 запаведзяў». У ходзе гульні каманды «Вясёлка» і «Сонейка» выконвалі заданні «Схованкі», «Наборшчыкі», «Скарагаворкі», «Пазнай твор», адгадвалі загадкі, успаміналі прыказкі і даказалі, што яны ведаюць і любяць родную мову. Мерапрыемства суправаджалася відэаклiпамі «Родная мова», «Гаворка беларуская».

Арэхаўская ПБ, 25 чал.

**21 лютага**

Падчас правядзення пасяджэння аматарскага клуба «Светлячок» адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя «Родная мова, цудоўная мова! » для вучняў СШ №1 3 «А». Бібліятэкар рассказала пра гісторыю ўзнікнення беларускай мовы, пазнаёміла з творчасцю мясцовых паэтаў. Дзеці пачыталі вершы, паслухалі песні, прынялі ўдзел у гульнях «Словы - браты», «Жывы - не жывы». Прадстаўлена кніжная выстава «Тут мова беларуская як музыка гучыць».

Дзіцячы філіял, 23 чал.

**25 лютага**

Бібліятэка сумесна з Залескім цэнтрам культуры і вольнага часу правялі IV свята беларускай паэзіі і песні «Беларуская мова - мелодыя душы».

В сваце ўдзельнічалі: старшыня Брэсцкага аддзялення «Саюза пісьменнікаў Беларусі» Т. А. Дземідовіч, член саюза пісьменнікаў Беларусі Н. П. Кандрашук і мясцовыя жыхары. Гучалі вершы, байкі, урыўкі з паэм вядомых беларускіх класікаў, сучасных паэтаў і творы кобрынскіх вершатворцаў. Лепшыя ўдзельнікі ўзнагароджаны дыпломамі і памятнымі падарункамі. Гран-пры атрымала індывідуальны прадпрымальнік Наталля Прыймачук, спецыяльны прыз ад Саюза пісьменнікаў Беларусі дастаўся Івану Ворану, вучню восьмага класа. Падрыхтавана выстава-панарама «Жывое ў вяках беларускае слова», этнаграфічны куток «Народ жыве, пакуль жыве яго памяць». Спонсары свята - ЗТАА «БісолаГабрыэлеФарм» і прыватнае прадпрыемства «Саргас».

Залеская ПБ, 120 чал.

## Мерапрыемствы да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, Дня абаронцаў Айчыны

**14 лютага**

На гадзіну памяці «По просторам Афганских пустынь» запрошаны навучэнцы УА «Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж». Кадры дакументальнай кінахронікі, успаміны, якія прагучалі з вуснаў удзельніка баявых дзеянняў у Афганістане старшага прапаршчыка Фёдара Старуна, адкрылі падлеткам малавядомыя старонкі гісторыі.

Завяршылася мерапрыемства чытаннем патрыятычных вершаў і праглядам відэакліпа на песню кобрынскага барда Юрыя Харэвіча.

ЦРБ, 32 чал.

**14 лютага**

На ўрок памяці «Не тускнеют награды, если память жива» сабраліся члены краязнаўчага клуба «Каласок». Бібліятэкар расказала пра воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія жывуць на тэрыторыі Тэвельскага сельскага Савету (Аляксандр Мартысь, Віктар Альхавік) і пра загінуўшага на вайне прапаршчыка Віктара Корнева. Дзеці прачыталі вершы «Посвящение афганцам», «Я вернулся, мама», прагледзелі відэаролік «Кукушка».

Тэвельская ПБ, 19 чал.

**15 лютага**

Урок гісторыі «Афганістан… дни, ушедшие в вечность» прайшоў для навучэнцаў СШ №1 г. Кобрына. Успамінамі аб афганскіх падзеях і сваім удзеле ў ваенных дзеяннях у Афганістане падзяліўся капітан Віктар Яўгенавіч Бордзюг, які ўзнагароджаны ордэнам «За службу Родине в Вооружённых Силах СССР» III ступені. Музычным упрыгожаннем мерапрыемства стала выступленне В. Бордзюга. У яго выкананні прагучала песня «Афганістан».

ЦРБ, 39 чал.

**16 лютага**

Біблятэка правяла гадзіну памяці «Афганская война в стихах и песнях». Вядучыя расказалі гасцям пра мужнасць і гераічнасць салдат, якія прымалі ўдзел у ваенных падзеях у Афганістане, пазнаёмілі з тэматычнай выставай «Из пламени Афганистана». Старшыня сельскага Савета Пікула Вера Пятроўна павіншавала воінаў-інтэрнацыяналістаў і ўручыла ім памятныя падарункі. Мерапрыемства суправаджалася паказам слайд-прэзентацыі «По долгу службы, по велению сердца». Аформлена кніжная выстава «Афганистан: мужество и память». Канцэртная праграма арганізавана работнікамі Дзівінскага Цэнтра культуры і дасуга.

Дзівінскі філіял, 39 чал.

**23 лютага**

У рамках праекта «Бібліятэка без межаў» адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя «Альянс добра, любви и благородства». З віншавальным словам перад мужчынамі Брэсцкай абласной арганізацыі ГА «БелТІЗ» выступіла Валянціна Смяховіч. Выдатным падарункам для мужчын стаў святочны канцэрт, падрыхтаваны ўдзельнікамі вакальнай групы цэнтральнай бібліятэкі «Фантазія» і бібліятэкарам Дзівінскай публічнай бібліятэкі Таццяны Гурыш.

ЦРБ, 36 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**9 лютага**

Літаратурна-музычная вечарына «Мелодия любви…» прайшла ў рамках праекта «Бібліятэка без межаў». У мерапрыемстве прынялі ўдзел падапечныя аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН і падапечныя Кобрынскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната. Свае творчыя нумары падарылі прысутным удзельнікі клуба «Сустрэча» Кобрынскага ТЦСАН, падапечныя Кобрынскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната, вакалісты Надзея Пракаповіч, Алена Міхейкінай-Беляковай і Наталля Раманюк.

*Казакова, А. «Мелодия любви…» / Анна Казакова // Кобрынскі веснік. – 2023. - 22 лютага (№ 14). – С. 8.*

ЦРБ, 51 чал.

**19 лютага**

Прайшло чарговае пасяджэнне літаратурнага клуба «ПоэтиКо». Аўтары падзяляліся сваёй паэтычнай творчасцю, у тым ліку актавамі, напісанымі ў якасці дамашняга задання. Прынялі ўдзел у конкурс «Адгадай паэта», падчас якога прысутныя павінны былі адгадаць аўтара зачытанага верша.

ЦБ, 17 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3 85 81